іх жыцці адбываецца нешта ўнікальнае. Для віцяблян гэта права было натуральным працягам тых правоў, якімі яны карысталіся раней. Яго ўвядзенне стала спробай замацаваць за мяшчанамі іх старажытныя правы і абавязкі ва ўмовах саслоўнага грамадства. Тым не менш, застаецца фактам, што віцебскае права аформілася ў самадастатковую сістэму саслоўных правоў мяшчанства і ў якасці гатовай мадэлі было нададзена шэрагу іншых месцкіх паселішчаў. Віцебскае месцкае права – адзіная мадэль месцкага права славянскага паходжання, якая дзейнічала на тэрыторыі Усходняй Еўропы ў XVI – першай палове XVII ст.

1. Макараў М. Дз. Ад пасада да магдэбургії: праваое становішча насельніцтва местаў Беларускага Падзвіння ў XIV – першай палове XVII ст. Мінск: Экаперспектыва, 2008.
2. Von Werdt, C. Stadt und Gemeindebildung in Ruthenien: okzidentalisierung der Ukraine und Weißrusslands im Spätmittelalter und in der frühen Neuzeit. Wiesbaden: Harrassowitz Verlag, 2006.
3. Wyrozumski J. Dzieje Polski piastowskiej (VIII wiek – 1370). Kraków, 1999.

**Доўнар А.Б.**

## ПРЫВІЛЕІ ВІЦЕБСКА СА ЗБОРУ ПЕРГАМІНАВЫХ АКТАЎ ГАЛОЎНАГА АРХІВА СТАРАЖЫТНЫХ АКТАЎ У ВАРШАВЕ

У часы Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ) гарады клапаціліся аб павышэнні свайго статуса ў дзяржаве і аб павелічэнні сваёй «упрывілеяванасці». Таму кожны горад імкнуўся распаўсюдзіць на сябе як мага большую колькасць правоў і свабод. Не выключэннем быў і Віцебск.

Віцебск меў даўнія традыцыі самакіравання з часоў, калі ён быў цэнтрам Віцебскай зямлі. У XV – першай палове XVI ст. віцебскія мяшчане карысталіся разам з князямі, баярамі-шляхтай і іншымі свабоднымі катэгорыямі насельніцтва Віцебшчыны агульным земскім прывілеем Віцебскай зямлі. З умацаваннем шляхецкай дэмакратыі і кансалідацыяй саслоўяў сітуацыя з юрыдычным афармленнем праў горада змянілася і мяшчане сталі імкнуцца мець свае прывілеі. Чаго і дабіліся ў 1561 г. [4. с. 82-85].

Асноватворнымі для Віцебска былі прывілеі 1561, 1582, 1592, 1597, 1641, 1650, 1669, 1676, 1697, 1735 і 1767 гадоў. Кожны прывілей меў свае адметнасці і свой лёс. Мяшчане Віцебска клапатліва захоўвалі арыгіналы сваіх прывілеяў ў гарадскім архіве на працягу XVI–XVIII ст. Але ў пачатку XIX ст. арыгіналы прывілеяў Віцебска зніклі. Па звесткам А. Сапунова арыгіналы віцебскіх гарадскіх прывілеяў былі пасланы ў 1803 г. віцебскім пракурорам Манькоўскім у Санкт-Пецярбург міністру юстыцыі Расійскай імперыі па справе мяшчан Віцебска, якія прасілі аб захаванні праў і прывілеяў горада. Але гарадскія дакументы па прызначэнню не былі дастаўлены [3. С. XXI]. Далейшы лёс прывілеяў застаўся невядомым. І пытанні: ці былі давезены прывілеі да Санкт-Пецярбурга, ці яны прапалі па дарозе, застаюцца без адказу і цяпер.

Так ці інакш, у цяперашні час пяць прывілеяў Віцебска XVI – XVIII ст. захоўваюцца ў Галоўным архіве старажытных актаў у Варшаве (далей – ГАСА) ў Зборы пергамінавых актаў. Гэта прывілеі Віцебска польскіх каралей і вялікіх князей літоўскіх Жыгімонта III Вазы ад 13 кастрычніка 1592 г. і 17 сакавіка 1597 г., Яна III Сабескага ад 20 сакавіка 1676 г., Аўгуста III ад 27 лістапада 1735 г. і Станіслава Аўгуста ад 01 студзеня 1767 г. (гл. табліцу).

*Табліца: Месца знаходжання арыгіналаў прывілеяў Віцебска*

| Сігнатура | Дата | Арыгінальнасць | Матэрыял дакумента | Памер дакумента |
|---|---|---|---|---|
| ГАСА. Збор пергамінавых актаў. № 9136 | 13.10.1592 | арыгінал | пергамін | 73 ×44+10,5 |
| ГАСА.Збор пергамінавых актаў. № 9137 | 17.03.1597 | арыгінал | пергамін | 66,7×44,5+9 |



Репозиторий ВГУ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| ГАСА.Збор пергамінавых актаў. № 9138 | 20.03.1676 | арыгінал | пергамін | 78 ×39,5+14 |
| ГАСА.Збор пергамінавых актаў. № 9139 | 27.11.1735 | арыгінал | пергамін | 85×54+9,3 |
| ГАСА.Збор пергамінавых актаў. № 9140 | 01.01.1767 | арыгінал | пергамін | 31×43 – 6 л. афармлены як сшытак |

Па інфармацыі, змешчанай у вопісе Збору пергамінавых актаў ГАСА, віцебскія прывілеі трапілі ў Варшаву дзякуючы Адаму Сцябельскаму. А. Сцябельскі відаць быў афіцэрам польскай арміі II Рэчы Паспалітай (на жаль, аўтару пакуль не ўдалося ўстанавіць, у складзе якога ваеннага падраздзялення ён служыў. Згодна з яго нататкамі ў маі 1920 г. ён знайшоў дадзеныя дакументы ў «разбітай бібліятэцы» аднаго маёнтка ў ваколіцах Лепеля. Пасля прыслаў іх у Варшаву для захоўвання ў сховішчах Помнікаў мастацтва і культуры, якія былі вывезены з тэрыторыі памежжа («Крэсаў») ахопленных вайной, Таварыства Стражы Крэсавай («Straż Kresowej»). Пасля ліквідацыі гэтага Таварыства А. Сцябельскі прывілеі забраў і захоўваў у сябе. напрацягу 20 – пачатку 40-х гадоў XX ст. А 10 кастрычніка 1943 г. у прадмесці Варшавы Віланове склаў вышэйзгаданую запіску аб гісторыі знаходкі прывілеяў Віцебска [2. Вопіс, пазіцыі 9136 – 9140]. Як вядома, пад час Варшаўскага паўстання 1944 г. ў Віланове захоўвалася частка найбольш каштоўных дакументаў ГАСА, і хутчэй за ўсё у гэты час прывілеі Віцебска патрапілі да супрацоўнікаў дадзенага архіва.

Прывілеі Віцебска, якія захаваліся ў ГАСА, з’яўляюцца важнымі для гісторыі горада. Іх важнасць сыходзіла і сыходзіць з іх зместу. Неабходнасць іх захавання разумелі тагачасныя віцебскія мяшчане, у сувязі з чым імі ствараліся правамоцныя копіі прывілеяў, напрыклад, у кнігах Метрыкі ВКЛ (так, прывілей Віцебску польскага караля і вялікага князя літоўскага Яна III Сабескага 1676 г. быў запісаны ў 148 кнігу запісаў Метрыкі ВКЛ, а Аўгуста III 1735 г. – у кнігу запісаў № 169 [5, спр. 148, арк. 167 – 171; спр. 169, арк. 100]. Аналіз кожнага прывілея Віцебска патрабуе асобнага даследавання.

Важнасць прывілеяў Віцебска разумелі і даследчыкі гісторыі Віцебска, у сувязі з чым імі былі апублікаваны некаторыя з іх. Так, былі апублікаваны прывілеі Жыгімонта III Вазы ад 13 кастрычніка 1592 г. [3, № 32, с. 61-67] і ад 17 сакавіка 1597 г. [1, № 118, с. 203- 206; 3, № 37, с. 74-82], Аўгуста III ад 27 лістапада 1735 г. [3, № 101, с.183-188].

Асобнай увагі патрабуюць маргінальныя запісы прывілеяў. Так, ва ўсіх пяці прывілеях пасля подпісаў манархаў і пісараў утрымліваюцца запісы аб тым, што 25 верасня 1803 г. прывілеі былі запісаны ў актавыя кнігі віцебскага земскага суда, і што іх прадставіў для запісу «глава места Віцебска» Ануфрый Бык. Дадзеныя запісы былі замацаваны подпісамі ўраднікаў віцебскага земскага суда: суддзі Ігнація Лускіны і пісара Станіслава Зарэцкага. Відаць, перад адпраўкаў прывілеяў у Санкт-Пецярбург гарадскія ўлады вырашылі падстрахавацца і зрабіць афіцыйныя копіі дадзеных дакументах.

Вельмі важным для прасочвання лёса віцебскіх прывілеяў з’яўляецца запіс на адвароце прывілея 1735 г.: «читалъ А. Шидлевский заседатель Игуменского уездного(?) суда. Июля 2 д(ня) 1856 г.» [2, №9139], з якога вынікае, што прывілей ў 1856 г. знаходзіўся, хутчэй за усё, у Беларусі.

Такім чынам, папярэдні аналіз запісаў і лёса прывілеяў Віцебска, якія захаваліся ў Зборы пергамінавых актаў ГАСА, з аднаго боку падцвярджае факт іх вывазу з Віцебска ў 1803 г. і дазваляе сцвярджаць, што ў сярэдзіне XIX – пачатку XX ст. яны знаходзіліся ў Беларусі; з другога боку ставіць пытанне аб высвятленні дакладнага месца іх захоўвання і іх трымальнікаў ў гэты час.

1. Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографической комиссиею. В 5 т. – Спб.: Тип. Э.Праца, 1846 – 1853, – Т. 4. – Спб.: Тип. Э.Праца, 1851. – 583 с.
2. Галоўны архіў старажытных актаў (Варшава). Збор пергамітных актаў.



Репозиторий ВГУ

3. Витебская старина /Сост. и изд. А. Сапунов. – Витебск, 1883. – Т. 1.
4. Макараў М. Ад пасада да магдэбургіі: прававое становішча насельніцтва местаў Беларускага Падзвіння ў XIV – першай паловы XVII ст. – Мінск: Экаперспектыва, 2008. – 248 с.
5. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. КМФ-18 Метрыка ВКЛ). Воп. 1.

**Глушков С.Н.**

## КАМЕННЫЙ КРЕСТ У д. БЕЗДЕДОВИЧИ КАК ИСТОЧНИК ПО ИСТОРИИ ПОЛОТЧИНЫ

“Археологическія розысканія въ окрестностяхъ г. Полоцка” – под таким заголовком в нескольких номерах “Витебских Губернских Ведомостей” 60-х годов XIX ст., в неофициальной их части, печатал свои заметки преподаватель Полоцкого Духовного училища, известный краевед Ксенофонт Говорский. Немало потрудившись на ниве изучения нашего края, он оставил целый ряд открытий, имеющих немалую и непреходящую ценность для дальнейшего исторического исследования Полотчины.

К сожалению, время и люди далеко не всегда бережно хранят материальные вехи своей истории. И если заинтересованный человек и теперь еще смог бы найти в окрестностях Полоцка описанную Говорским Ольгердову дорогу (XIV в.) или осмотреть уникальные, протяженностью более полукилометра, земляные укрепления Глинского замка (XVI ст.), то неудачей закончилась бы попытка увидеть старинный каменный крест с выбитым на нем текстом, что испокон стоял на Disненском ответвлении вышеупомянутой дороги у дер. Бездедовичи, в имении местного помещика Обрампальского. В свое время и моя попытка отыскать крест не увенчалась успехом. Тогда подумалось, что, вероятнее всего, это одна из многих невозвратных потерь прошлого, духовного безладья столетия. Но прошло много лет и случилось, казалось бы, невероятное – крест отыскался!

Впервые, это известное всей Ветринской округе каменное изваяние, описал в своих дневниках 1818 года исследователь белорусских древностей Петр Кеппен. Тогда же им была предпринята попытка прочесть текст, но, разобрав самую малость, он оставил это занятие, сославшись на плохую его сохранность и недостаточную древность надписи, якобы не представляющей большого интереса. Осенью того же года крест в имении Бездедовичи осматривали архимандрит И. Шулакевич и полицмейстер Двинского судоходства Мосальский, о чем и сообщалось в его рапорте генералу Е. Ф. Канкрину, известному исследователю “Борисовых камней”. Почти через сорок лет осмотрел крест и сделал еще одну попытку прочесть надпись Говорский. Но и ему удалось разобрать немногим более Кеппена. Упоминается об этом кресте и в трудах нашей современницы, кандидата исторических наук Людмилы Дучиц. Так, уже известным науке, но неразгаданным, пролежал он более ста лет, пока по каким-то своим соображениям уже в наше время хозяин соседней крестьянской усадьбы не закопал крест в землю. Однако, казалось навсегда утерянный, пролежав несколько десятилетий под спудом, крест был откопан, благодаря живому участию местных жителей, в особенности Сергея Николаевича и Валерия Сергеевича Козловых и Аллы Васильевны Шпак, а стараниями исследовательницы Ветринского края Ольги Ситдиковой стала возможна экспедиция, приведшая в итоге к полному прочтению текста и разгадке наиболее вероятной истории древнего креста.

Опираясь на прежний опыт изучения таких предметов, учитывая форму, способ изготовления и другие особенности, крест этот уверенно можно отнести к древнейшим антропоморфным (человекоподобным) фигурам, время изготовления которых в мировой практике условно относят к эпохе бронзы, что для нашего региона соответствует второму тысячелетию до Р.Х. Однако анализ легенд и преданий собранных учеными-энтузиастами на протяжении XIX и XX столетий, рассказов местных старожилов и тематических научных источников, а так же собственных наблюдений, дает все основания отнести время изготовления таких человекоподобных фигур к верхнему палеолиту или мезолиту (среднему каменному веку), т.е. к 10-му или 9-му тысячелетию до Р.Х., что соответствует времени



Репозиторий ВГУ